ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 34 (416) Пятніца, 25 сакавіка 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

Што сказаў апошні пленум ЦК

Апошні пашыраны пленум ЦК ЛКСМБ гаварыў і вынес рашэньне па наступным 4-м пытаньням: Справаздачны даклад бюро ЦК ЛКСМБ, аб зьмесьце працы піонэратраду і формах кіраўніцтва яго працы, даклад Наркамзему аб практычных задачах па сельскай гаспадарцы з садакладам аб удзеле комсамолу ў працы сельска-гаспадарчай коопэрацыі і апошнім пытаньнем абгаварвалася аб працы вячэрніх школ рабочай моладзі, вячэрніх школ сялянскай моладзі і сельска-гаспадарчых гуртков.

Справаздачны пэрыод працы бюро ЦК ЛКСМБ—пэрыод значных посьпехаў. Баявой задачай зьяўляецца барацьба за моладзь. Комсамольскія організацыі павінны ў справе ўвязаць культурную працу з палітычнымі задачамі саюзу. Патрэбна рашуча перабудаваць заняткі па політпісьменнасьці, інакш яе ніхто вывучаць ня будзе. Комсамол энэргічна змагаўся і павінен змагацца за разумны адпачынак і гульні для моладзі, за паднятые яе політычнага, культурнага і асьветную ўзроўню. Комсамол з вялім нажымам, гарачай энэргіяй, упартасьцю змагаўся і будзе змагацца за паляпшэньне сельскай гаспадаркі, за рацыяналізацыю прамысловасьці, за новую сілу, за падрыхтоўку сьвежай кваліфікаванай рабочай сілы. На пленуме адзначалася, што зараз у комсамоле растуць кадры актывістых, прыстасаваных да новых задач ЛКСМБ; яны робяць сваю справу не па пасяджэньнях не ў выглядзе мора абежнікаў і тэзісаў, а на практычнай працы ў форме жывога кіраўніцтва, будучы цесна зьвязаны з масамі, з ячэйкамі. **На такіх актывістаў мы павінны трымаць курс.** Зьвярнуць максымум увагі з боку грамадзкасьці на піонэрорганізацыю, асабліва ў яе пераломны момант працы. Далейшыя практычныя задачы ў справе правядзеньня нацполітыкі павінны быць накіраваны да выкананьня вынесеных пастаноў партыі па гэтаму пытаньню з прыцягненьнем цяжкасьці на ўдзел у культурным будаўніцтве і ўцягненьню працоўнай моладзі ўсіх нацыянальнасьцяй у гэтую працу.

Усе гэта знайшло свае практычнае выраламленьне ў пастановах і рашэньнях пленуму, над правядзеньнем у жыцьцё якіх павінны працаваць організацыі і ячэйкі.

За некалькі дзён да пашыранага пленуму ЦК ЛКСМБ, ЦК КПБ заслухоўваў даклад «Аб становішчы экономічнай і эдукацыйнай працы сярод рабочай моладзі». На лютаўскім пленуме ЦК КПБ заслуховаўся даклад аб усёй працы ЦК ЛКСМБ і становішчы комсамолу Беларусі. Былі вынесены сталыя і падрабязговыя рашэньні. Новых рашэньняў па справаздачы бюро ЦК ЛКСМБ пашыраны пленум не прымаў, а цалкам далучыўся да пастаноў, вынесеных ЦК КПБ і яго лютаўскім пленумам, прапанаваў усім ячэйкам і організацыям разглядзець, вывучыць рашэньні ЦК КПБ аб комсамоле і прыкласьці ўсе сілы да практычнага правядзеньня іх у жыцьцё.

Асаблівай увагі заслугоўвае пытаньне «аб зьмесце працы піонэратраду і формах кіраўніцтва яго працы».

Узмацніць грамадзка-політычную дзейнасьць, уменьне ў працы атраду адгукнуцца на розныя асаблівасьці, здарэньні данай мясцовасьці і запатрабаваньні дзіцяці. Праца атраду павінна быць так пастаўлена, каб піонэр атрымліваў паступова ўсё больш і больш грамадзка-політычныя, санітарна-працоўныя і культурныя навыкі. Зьмест працы павінен быць зразумелым, цікавым і забясьпечыць максымум самадзейнасьці. Зьмест працы павінен быць узгоднены з програмамі школы. Тэхнічныя навыкі, экскурсіі, разумныя гульні, добра распрацаваныя заданьні і інш. прыкоўвае да сябе ўвагу піонераў. Складанасьць піонэрпрацы патрабуе ад ячэек найбольшых клапот аб кіраўніку атраду і найбольшай дапамогі яму ў яго працы.

Што датычыцца дакладу Наркамзему і сельска-гаспадарчай коопэрацыі, дык тут пленум падкрэсьліў, што праца комсамолу ў вёсцы па будаўніцтву новага жыцьця павінна галоўным чынам заключацца ў актыўным удзеле ў той працы, якую партыя і Савецкая ўлада праводзяць па падняцьцю сельскай гаспадаркі і па падняцьцю пісьменнасьці сялянства.

Прымаючы ўдзел у падняцьці сельскай гаспадаркі, у коопэрацыйным будаўніцтве, у перабудове ўсёй вёскі на соцыялістычны лад, пленум падкрэсьліў разглядаючы апошняе пытаньне аб ВШРМ, ВШСМ і с.-г. гуртках, што організацыі павінны памятаць, што без падняцьця агульнага разьвіцьця культурнага і політычнага ўзроўню, бяз сельска-гаспадарчых і тэхнічных ведаў немагчыма будзе зрабіць БССР перадавой культурнай краінай.

Агульны лік і праца сельска-гаспадарчых гурткоў ВШРМ і ВШСМ паказвае нам, што гэта справа стала ўжо масавай, маючы ня толькі гаспадарчае, але і аграмаднай важнасьці політычнае значэньне, таму да гэтых відаў асьветы павінна быць шырока мобілізавана і прыцягнута ўвага і ініцыятыва мясцовых політасьветных комсамольскіх, партыйных, савецкіх і профэсыйных установ. Пленум выказаўся за пашырэньне сеці ВШСМ да двух на раён па каштарысу і каб у кожным мястэчку была ВШРМ.

Улічваючы тое, што ў працу ВШСМ і сельска-гаспадарчых гурткоў слаба ўцягнуты нацменаўскія групы (яўрэі, палякі, латышы, немцы і інш.) ухвалена дамагацца большага іх уцягненьня ў гэтыя формы асьветы і організацыі асобных для іх школ і гурткоў на роднай мове.

Гэтым у асноўным вычэрпваюцца рашэньні апошняга пленуму ЦК ЛКСМБ. Трэба зрабіць усе захады да практычнага правядзеньня іх у жыцьцё.

Да будаўнічага сэзону.

Будаўнічы сэзон надыходзіць. Сёлетні будаўнічы сэзон мяркуючы на адпушчаных дзяржаваю сродках на капітальны рэмонт прамысловасьці і на кватэрнае будаўніцтва абяцае быць досыць значным, акрамя гэтага павялічаны асыгнаваньні на грамадзкія працы і дарожнае будаўніцтва.

Усё гэта прымушае нашы організацыі заваечасова падрыхтаваць усе пытаньні, зьвязаныя з эконом працай сярод рабочай моладзі, бо ў мінулым годзе заўважаўся шэраг недахопаў—рабочую сілу з падросткаў і моладзі набіралі хто як хацеў; навучаньне пастаўлена было дрэнна, (асабліва пры індывідуальным навучаньні), абслугоўваньню культурных патрэб сэзоннай моладзі, а гэтак сама і політычнай працоўцы іх комсамольскімі ячэйкамі было аддадзена вельмі мала ўвагі.

Перад намі стаяць наступныя конкрэтныя задачы:

1. Даць працу усёй беспрацоўнай моладзі — будаўнікам (у Менску іх каля 500 чал.) на рознастайных будаўнічых работах забясьпечыўшы пастаноўку іх навучаньня праз організацыю брыгад, компэнсацыю майстрам. Адпаведна кваліфікацыі забясьпечыць заработнай платай.

2. Дамагчыся, як бы там ні было, прыняцьця падросткаў на будаўнічыя работы як на броні, так і па асобных арцелях праз біржу працы. Неабходна каб Наркампрацы выдаў пастанову адносна броні у будаўнічым сэзоне. Нашым працаўнікам на біржы працы, прадстаўнікам комсамолу у профорганізацыях неабходна асяродкаваць увагу да гэтага пытаньня.

3. Асобная ўвага павінна быць аддадзена пытаньню падрыхтоўкі рабочай **кваліфікаванай** сілы. У мінулым годзе адчуваўся вялікі недахоп у кваліфікаваных рабочых, асабліва каменьшчыках і штукатуршчыках. У гэтым годзе недахоп будзе яшчэ большы. Неабходна ўзяць больш рашучы курс на павялічэньне ліку вучняў (павялічыць проц. броні ў тых галінах, дзе адчуваецца недахоп кваліфікаванай сілы).

4. Трэба памятаць, што ў будаўнічую працу ульецца і такая частка рабочых, якая будзе глядзець на працу, толькі як на крыніцу заработку, будзе толькі старацца больш «выгнаць монэты», дзякуючы чаму якасьць працы пагаршаецца.

Сёлетняе будаўніцтва адрозьніваецца ад будаўніцтва мінулых год тым, што ў гэтым годзе будуць будавацца новыя будынкі, а раней былі рамонты. Гэта прымушае нас правесьці зараз-жа шырокае растлумачэньне праз сходы, конфэрэнцыі, друк, дзе дэтальна абмяркаваць усе гэтыя пытаньні і як сьлед—наладзіць масавую экономічную і культурную працу.

5. Неабходна ўцягнуць на грамадзкія працы і дарожнае будаўніцтва (у апошняе трэба ўцягнуць і вясковую моладзь) моладзь у тым размеры, колькі складае проц. яна у адносінах да дарослых рабочых на біржы працы.

Выключнае значэньне будзе мець правільная пастаноўка комсамольскай працы сярод гэтай моладзі ў сэнсе яе організацыйнага абхопу і пастаноўкі экономічнай і культурнай працы.

С. Снэйдэр.

У іх лепшае вока

і самы моцны сталёвы кулак.

Слаўны лінкор „Парыская Комуна“, шэфамі якога зьяўляемся мы, з гонарам нясе сваё гэроічнае імя!

18-га сакавіка ў дзень памяці парыскіх камунараў, падшэфны нам лінейны карабель «Парыская Комуна» сьвяткаваў карабельнае сьвята.

Быць дастойнымі байцоў „Парыскай Комуны“.

У дзень сьвяткаваньня Рэволюцыйны Ваенны Савет Марскіх Сіл Балтыцкага мора зьвярнуўся да камандаваньня лінкору з лістом, у якім гаворыцца:

Камісар лінкору «Парыская Комуна» т. Настусевіч.

«успамінаючы адданую хробрасьць загінуўшых комунара, ў імя якіх прысвоена Вашаму караблю, Рэволюцыйны Ваенны Савет Марскіх Сіл Балтыцкага мора ўпэўнен, што асабісты склад лінейнага караблю з цьвёрдасьцю, энэргіяй і самаддачасьцю, дастойнымі байцоў Парыскай Комуны, будзе падтрымоўваць баявую магутнасьць свайго караблю і флёту, вядучы яго па шляху ўрачыстасьці комунізму ва ўсім сьвеце».

Чырвонафлётцы «Парыскай Комуны» з гонарам нясуць гэта пачэснае рэволюцыйнае імя!

З году ў год мацнее магутнасьць лінкору.

— Асабісты склад лінкору «Парыская Комуна» можа са здавальненьнем азірнуцца на шлях, пройдзены караблём на працягу трох апошніх гадоў.—Так піша камандзір «Парыскай Комуны» т. **Самойлаў.**

Кампанія 1924 году прашла для карабля ў вельмі цяжкіх умовах—адбудовы мэханізмаў і ажыўленьня караблю амаль што выключна карабельнымі сродкамі. Манэўры 1924 г. паказалі, што асабісты склад з працай справіўся надта добра і праца караблю адзначана загадам Рэвваенсаветам СССР, а гэтак сама атрымала адабрэньне ад Вышэйшага Морскага Камандваньня.

Самае цяжкое было зроблено.

Але дасягнутага было яшчэ мала. Узімку 1924-25 г. працягвалася упартая праца па рамонту мэханізмаў, а з пачаткам кампаніі—бесперарыўная вучоба і ўдасканаленьне ў справе уменьня ўладаюць аружжам і мэханізмамі.

Кампанія 1926 г.—чарговая ступенька прогрэсу лінкору па ўсіх галінах.

Упартай штодзеннай працай і вучобай асабісты склад лінкору дасягнуў баявой падрыхтаванасьці. Тыя шматлікія прызы па сувязі, па артылерыі і інш., якія атрыманы лінкорам на агульнафлёцкіх спаборніцтвах—кажуць аб гэтым.

Трыццаць пяць прыкладных.

Шэф лінкору—комсамолія Беларусі павінна ведаць прыкладных.

Усе яны комсамольцы.

Гэта сапраўды на «яць» мальцы.

Ну, напрыклад **І. М. Брагін**, прызыву 23-24 г. комсамолец, старшыня матарысты, выявіў выключную энэргію і працаздольнасьць па рамонце і абслугоўваньні дызалей.

Пад камандай у т. Брагіна 12 чал. чырвонафлётцаў і ён добра і цьвёрда накіроўвае іх працу.

За ўвесь час службы Брагін не атрым-ў ані воднага дысцыплінарнага ўзыску і спадзяецца ня мець іх і ў будучыні.

Вось які Брагін. На аднэй ступэні з ім стаяць і 34 іншых прыкладных. Вось іхнія прозьвішчы:

Рабікін, Чыжыкаў, Дзвыдаў, Маркулаў, Капітонаў, Усаў, Касухін, Калюлаў, Скарадумаў, Сямёнаў, Кашалеў, Іванаў, Малышкаў, Старыкоў, Мінаеў, Фіялкін, Ільюнцаў, Калашнікаў, Паўлаў, Васільеў, Мікалаеў, Сярэбраньнікаў, Дземічаў, Кандрацьеў, Софін, Сумін, Міканораў, Цестаў, Гарбуноў, Казакоў, Сапрончык, Рашотнікаў і Гураў Нагібін.

Карабель комсамольцаў

«Парыская Комуна»—гэта карабель комсамольцаў. 42 проц. са ўсяго складу лінкору—комсамольцы і партыйцы. Шмат увагі аддаецца працы з комсамольцамі. Комсамольцы вылучаюцца ў першыя шэрагі, але разам з гэтым прад'яўляецца ім суровае запатрабаваньне:

Быць першым! Гэта значыць быць першым у дысцыпліне, у вучобе, практыцы.

І гэта відаць на караблі. Шмат цікавага могуць паказаць вам комсамольцы—маракі з «Парыскай Комуны» — нашага Падшефнага.

Але перш за ўсё, яны папросяць вас падняцца на верхнюю палубу, і палюбавацца дзьвюма чырвонымі зоркамі. Адна з іх намалявана на арудзійнай вежы, а другая—на сыгнальным мосьціку.

Што гэта знача?

— Гэта знача, што наш лінкор лепшы па стральбе і па сыгналізацыі ва ўсёй брыгадзе.

— У нас лепшае вока і самы моцны сталёвы кулак!

Малайцы падшэфнікі!

Шэфу—комсамолу Беларусі.

У дзень памяці парыскіх комунараў, у дзень нашага карабельнага сьвята, шлем гарачае чырвонафлёцкае прывітаньне шэфу—комсамолу Белалусі.

Сёньняшні дзень агляду нашых баявых сіл дае ў нашых дасягненьнях больш плюсаў, чым мінулыя годы.

Імя парыскіх комунараў—нясем мы з гонарам, апраўдваючы яго. Лінейны карабель «Парыская Комуна» зьяўляецца грозным вартаўнічым на подступах да гораду Леніна.

Не малую дапамогу ў умацаваньні боядольнасьці дае нам шэфства.

Упэўненыя, што ў далейшым наша шэфства, наша жывая, органічная сувязь будзе мацнець, упэўняем, што мы прыкладзем усе патугі для яе ўмацаваньня і разьвіцьця.

У патрэбную хвіліну—мы заўсёды будзем гатовы.

Няхай жыве шэф—комсамол Беларусі!

Будзем узмацоўваць сувязь не на словах, а на справе,

18 сакавіка 1927 г.

Старшыня урачыстага сходу Камісар лінкору «Парыская Комуна»—НАСТУСЕВІЧ.

Хэмія Пятруся Лазоўскага.

З хэміяй Пятрусь Лазоўскі пазнаёміўся на прадвесьні свайго жыцьця. Да гэтых пор яшчэ дваровыя каты памятуюць той страшны час, калі факеламі пылалі іх аблезлыя хвасты, якія абліваў газай і падпальваў пачынаючы хэмік... Хвастамі катоў Пятрусь не абмяжоўваўся. Ён шоў далей. Такія складаныя навуковыя вопыты, як пляваньне ў студню, злучэньне гарчыцы з супам, лоўля соцен мух і заключэньне іх у бутэльку малака і г. д. займалі амаль увесь яго час. Недарма Пятрусь вырас ужо даволі вопытным і моцным хэмікам.

Гэніяльнаму юнаку патрэбен быў простор для далейшай навуковай дзейнасьці. Але людзі яго не разумелі... Людзі не дагадваліся, што побач з імі сьпее дзіўны гэній, буйнейшая навуковая велічыня, якая з цягам часу ўстрасла-б увесь сьвет сваімі вынаходжаньнямі...

І Пятрусь сумаваў...

У хуткім часе ён паступіў у Менскую школу ФЗВ скурвытворчасьці. Там ён зрабіўся комсамольцам. Пачаў займацца ў вячэрняй школе.

У школе выкладалі хэмію — але гэта ні ў якай меры не здавальняла Пятруся! І на самай справе: вучылі якімсьці сухім формулам, паказвалі нявінныя вопыты... Кісларод... Вадарод... Валентнасьць... Рэакцыя... Фэ! Як гэта няцікава...

Пятрусь жадаў размаху, моцных перажываньняў, галавакружыцельных вынаходжаньняў, а тут—на табе вывучай уласьцівасьці якога небудзь паршывенькага азону, ці азоту! А чым азот лепш азону?. Усё гэта—глупства...

Наш гэніяльны юнак зноў засумаваў.

Але раптам лёс, які заўсёды дапамагае гэніяльнасьцям, адчыніў яму шлях да шчасьця. Лёс даў магчымасьць Пятрусю зноў заняцца любімымі вопытамі і рабіць навуковую кар'еру.

Справа ў тым, што ў храмова-барабанным аддзяленьні, дзе працуе Пятрусь Лазоўскі, знаходзяцца банкі з каштоўнай заграпічнай „сіняй фарбай“, якая ідзе на адзелку хрому. Выпадкова Пятрусь даведаўся, што калі разьвеяць „сінюю фарбу“ ў паветры—яна раздражае сьлізістую абалочку і гэта выклікае моцнейшыя прыступы чыханьня... Гэта было як раз тое, што патрэбна!

Выбраўшы зручную хвілінку, Пятрусь запусьціў лапу ў баначку, сьціснуў у пальцах жменю фарбы і няпрыкметна насыпаў яе на шырокі пас...

Праз хвіліну над цэхам закачаўся блакітны дымок і з рабочымі атрымалася нешта незвычайнае... Яны адчулі д'ябальскае шчакатаньне ў носе, вочы іх наліліся сьлязьмі, сьпіны абліліся халодным потам.

— А-а-а... пчых!

— А-а-а... пчых!

Грымотнае чыханьне некалькі дзясяткаў рабочых патрасло сьцены.

— А-а-а... пчых!

Чыханьне не давала ні хвілінкі пакою. У гэты памятны дзень хлопцы ведалі толькі дзьве справы: першая — несьціхаючае чыханьне, калі чалавек падымаецца на цыпачкі і прыкрывае вочы („А-а-а“); другая—актыўнае дзеяньне, калі раздаецца ўрэшце доўгачаканы гук і прыходзіць на некалькі сякунд палёгка („пчых“)...

А Пятрусь, які, паміж іншым, знаходзіўся ў гэты момант у другім аддзяленьні, быў на сёмым небе! Вопыт удаўся і як нельга лепш! Падобнага эфэкту, выключаючы толькі каціныя пылаючыя хвасты, Пятрусь ніколі ня ведаў!

Але юны хэмік, як сапраўдны гэній, не супакоіўся на сваіх дасягненьнях...

Аднойчы, калі ў аддзяленьні нікога ня было, Пятрусь набіў кішэню „сіняй фарбай“ і хутка пабег дамоў. Ен рашыў паспрабаваць моц свайго „газу“ на хатніх жывёлах...

Спачатку Пятрусь атакаваў старога рыжага ката Васю.

— Васінька—сказаў Пятрусь — хадзі сюды, міленькі... Я цябе пачастую...

Вася падышоў асьцярожнай вопытнай паходкай і ўставіў на хіміка таемныя зялёныя вочы. Але не пасьпеў Пятрусь выцягнуць з кішэні фарбу, як кот адчуў нешта нядобрае, ашчэрыўся, выгнуў сьпіну дугою, прамовіў грознае „ш-ш-ш“ і паскакаў назад...

Пятрусь вылаяўся і задумаўся:

— У сутнасьці—пранеслася ў галаве—людзі таксама адносяцца да катэгорыі хатніх жывёл... Чаму-б...

І не разважваючы далей ён накіраваўся ў кватэру суседкі-бабулькі, няпрыкметна рассыпаў парашок, а сам вышаў.

— З боку—парашыў Пятрусь—цікавей назіраць...

У бабулькі-суседкі сядзелі госьці—салідныя пажылыя людзі. Незвычайны прыступ насмаргу ахапіў раптам усіх. Больш усяго трасло адну тоўстую даму ў шоўкавым старамодным чэпчыку. Яна чыхала незвычайна праразьліва і пасьля кожнага „і-іх“—жагналася... Ёй ўтарылі цяжкае „ап-чух“ мужчын... Бедная гаспадыня была да таго зьдзіўлена зваліўшымся на галаву няшчасьцем, што нічога не магла казаць і толькі бязутрымна чыхала разам з усімі...

Калі абураныя госьці ўрэшце пакінулі яе кватэрку, яна лягла на ложку і ў перапынкі паміж чыханьнем чытала малітвы... Малітвы не дапамагалі... Бабулька чыхала ўсю ноч. З носу пашла кроў... А на заўтра яна ўбачыла ўсе рэчы ў сваёй кватэры пакрытымі дзіўным сінім налетам...

— Кара божая, кара божая—шапталі губы старой...

Сам „бог“, ён-жа гэніяльны хэмік Пятрусь Лазоўскі са здавальненьнем констатаваў факт „удалага вопыту“.

Праўду кажуць, што мы ня ведаем цаны людзям. Побач з намі расьце такі гэній, як комсамолец Лазоўскі і ніхто на гэта не зварочвае ўвагу. Гібне талант! Чэснае слова гібне!

Міх. Гольдбэрг.

З гумарыстычнай песьняй--весела!

У дапамогу хоргурткам зьмяшчаем нізку гумарыстычных народных песень.

Гэй, у лесе пры даліне.



Пры даліне у гушчары
Калыхаліся камары,
Гэй, гэй... і г. д.
Дуб да дуба пахіліўся,
Камар з дуба зваліўся.
Гэй, гэй... і г. д.
Набіў камар патыліцу
Аб дубову караніцу.
Гэй, гэй... і г. д.
Ой, пабіў камар бакі
Ды аб дубовыя сукі.
Да гэй, гэй... і г. д.
Ды пабіў камар калені
Аб дубовыя караньні.
Гэй, гэй... і г. д.
Высыпаліся ўсе зубы
Ды з камарыкавай губы.
Гэй, гэй... і г. д.
Ляціць муха ратаваць,
Зімнай вадой адліваць.
Да гэй, гэй і г. д.
— Камарочку, родны браце,
Як-жа цябе ратаваці?
Гэй, гэй... і г. д.
— Насылайце да аптэкі.
Ці ня будзе крыху лепш.
Гэй, гэй... і г. д.

У бальніцу завязіце
І мяне там палажыце.
Гэй, гэй... і г. д.
Там добрыя дахтары,
Вымуць душу без пары.
Да гэй, гэй... і г. д.
— Камарочку, родны браце,
Дзе-ж мне цябе пахаваці?
Гэй, гэй... і г. д.
— Не хавайце край дарогі,
Бо дратаваць будуць ногі.
Гэй, гэй... і г. д.
Не хавайце пры даліне,
Бо вырыюць мяне сьвіньні.
Гэй, гэй... і г. д.
Пахавайце ў цёмным лесе
Пры зялёненькім гарэсе.
Гэй, гэй... і г. д.
Будуць гарэхі шчыпаць,
Камарыка ўспамінаць,
Да гэй, гэй... і г. д.
— А ды чый-жа гэты помнік,
Ці маёр тут, ці палкоўнік?
Гэй, гэй... і г. д.
— Ні маёр тут, ні палкоўнік,
А сам камар супакойнік.
Гэй, гэй, ў лесе, ў лесе,
А сам камар супакойнік.

Ды ляцяць міскі

1. Ды ляцяць міскі і талеркі,
Што на мяне пагаворкі.
Ой, лю-лі, ой лю-лі, лю-лі,
лю-лі, лю-ляшкі*).
2. Сама села, падпёрлася,
Заплакала, уцёрлася.
3. Людзі кажуць—што ёй стала,
Чаму-ж замуж не папала?
4. Дзеўка замуж не папала,
Бо чыноўніцаю стала.
5. Як чыноўніцаю стала,—
Ахвіцэра пакахала
6. Ахвіцэра пакахала,
У жыцьці біды ня знала.
7 Ой, ня доўга так жылося—
Жыць на кухні давялося.
8. Біць талеркі, міскі стала,
Бо напрасна пакахала.

*) Увага. Пасьля кожнага куплету хор сьпявае: «Ой лю-лі», а саліст маўчыць.

У печы палю.

У печы палю, бульбу жару,
А на печы гарох пару.
Бедна-ж мая і яй-ха-ха!
Бедна-ж мая галава.
На печ ўзьлезу, гарох спару.
Ня лезь, Грышка, бо удару!
Бедна-ж і г. д...
Як удару не памалу.
Дык падкоцішся пад лаву.
Бедна-ж і г. д...
Ляжы, Грыша, ня рыдай
І-з пад лавы выглядай.
Бедна-ж і г. д...
Каля кузенькі ішла,
Малаточак я знашла.
Бедна-ж і г. д...
А мой Грыша кавалёчак,
Возьмі сабе малаточак!
Бедна-ж і г. д...

Ой, да ты, калініца

1. Ой, да ты, калініца,
Ой, да ты, малініца,
Ай, да ты ня стой, ня стой,
Ой, да на гары крутой.
Ой, да ты ня стой, ня стой,
Ой, да на гары крутой,
Ой, да ня спускай гальля
На сіняе мора.
3. Ой, да ня спускай гальля
Ой, да на сіняе мора.
Ой, да на сінім моры
Карабель плыве.
4. Ой, да на сінім моры
Ой, да карабель плыве,
Ой, да карабель плыве,
Мілага вязе.

Да Усесаюзнай конфэрэнцыі ЛКСМ

Культурніцтва і палітыка

Вялізарная цяга рабочай і сялянскай моладзі да «культуры» цалкам саўпадае з інтарэсамі і задачамі соцыялістычнага будаўніцтва. Больш таго. Сапраўдны ўдзел моладзі ў соцыялістычным будаўніцтве і ў горадзе і ў вёсцы патрабуе павышэньня культурнага ўзроўню мас моладзі. Роля культурніцтва ў сучасных умовах будаўніцтва набывае значэньне першай важнасьці.

Вось чаму перад комсамолам ва ўсю шыр, з усёй вастратой стаіць задача максымальнага разьвіцьця культурнай працы сярод мас моладзі.

Мешкаватасьць і нязграбнасьць на культурным фронце, няўменьне задаволіць культурныя запросы моладзі, непрыстасаванасьць форм, мэтадаў і зьместу працы да выкананьня гэтай задачы, чапляньні за чыстую «палітыку», бяссумленна, прынясуць вялікую шкоду Саюзу і аслабяць яго ўплыў на масы моладзі. Недастатковая ўвага збоку Саюзу культурнай працы прывяла-б да таго, што культурніцкі рух моладзі выплыў бы з комсамольскага ўплыву і кіраўніцтва, што бяссумленна зьнізіла-б палітычную ролю Саюзу.

Не адмахвацца ад культурніцтва і культурных запросаў, а імкнуцца найбольш поўна іх абслужыць—вось якая галоўная задача комсамолу ў сучасны пэрыод.

Комсамол павінен узначаліць культурніцкі рух, узяць кіраўніцтва ім у свае рукі, стаць яго організатарам.

Побач з небясьпекай недааццэнкі культурніцтва—маецца другая ня менш важная небясьпека, якая выяўляецца ў магчымасьці адрыву культурніцтва ад клясавых задач, ад інтарэсаў рабочай клясы ў цэлым. Голае разгортваньне культурніцтва, непадначаленьне яго агульна клясавым інтарэсам няміпуча прывядзе да таго, што культурніцтва пойдзе па лініі мяшчанскага індывідуалізму, цэхаўшчыны, імкненьне атрымаць веды і падняць кваліфікацыю толькі ў мэтах паляпшэньня свайго ўласнага матар'яльнага становішча і г. д. Гэту небясьпеку трэба бачыць і сваечасова папярэдзіць.

Усю культурную працу неабходна падначаліць палітычным задачам рабочай клясы. Наша культурніцтва ня можа быць аполітычным. У капіталістычных краінах соцыялістычныя організацыі моладзі прыкрываюцца сьцягам мнімай «аполітычнасьці» культурніцтва. На справе гэта мнімая «аполітычнасьць» служыць згодніцкім організацыям, сродкам адцягненьня моладзі ад клясавых задач і палітычнай барацьбы. «Аполітычнасьць» культурніцтва соцыялістычных організацый моладзі за межамі цалкам зыходзіцца з палітычнымі, клясавымі інтарэсамі буржуазіі.

Наша культурніцтва непавінна і ня можа быць адарвана ад палітычных задач рабочай клясы і яго партыі. Культурніцтва і палітыка павінны быць цесна ўвязаны. Аднак, проблема ўвязкі культурніцтва і палітыкі ня можа быць разьвязана чыстым мэханічным шляхам. Гэта задача разьвязваецца зусім ня тым, каб у кожны выгляд культурнай працы была абавязкова ўклінена «палітыка». Але ня тым, што мы прышпылім да кіно-сэансу палітычны даклад альбо да танцаў—політ-маскарад, разьвязваецца задача ўвязкі культурніцтва і палітыкі.

Разьвязаньне пытаньня ўвязкі культурніцтва і палітыкі заключаецца ў тым, каб забясьпечыць па ўсёй лініі культурнай працы кіраўніцтва і ўплыў комсамолу ў партыі, ў тым, каб забясьпечыць ідэолёгічную вытрыманасьць культурнай працы і, ўрэшце, у тым, каб рост культурнага ўзроўню мас моладзі падарожыўся ўцягненьнем яе ў актыўную агульна-палітычную дзейнасьць. Толькі пры гэтых умовах будзе забясьпечана моцная ўвязка культурніцтва і палітыкі ў працы комсамолу.

Пасьпяховасьць разьвіцьця культурніцтва ў многім залежыць ад правільнага і ўмелага кіраўніцтва гэтай працай. Вялікую шкоду можа прынесьці тут «казёншчына», трафарэтнасьць і пяруходасьць. Культурная праца надзвычайна складана і шматгранна. Розныя слаі моладзі (па ўзросту, кваліфікацыі і г. д.) прад'яўляюць розныя запатрабаваньні і запросы. У культурнай працы нельга падыходзіць з аднэй меркай да ўсёй масы моладзі. Выгляды, формы і зьмест культурнай працы павінны быць пабудованы такім чынам, каб задаволіць самыя рознавыглядныя запросы моладзі.

Кіраўніцтва з культурна-асьветнай працай павінна быць максымальна разьмяжована. У кіраўніцтве культурнай працай не павінна быць камандваньня і навязваньня формаў і мэтадаў «зверху». Неабходна разьвіць ініцыятыву і самадзейнасьць ячэек, юнсэкцый, хат-чытальняў патрымліваць усякае становучае пачынаньне нізавых організацый, аказваць ім дапамогу і падтрыманьне ў працы.

Неабходна прыцягнуць да організацыі і правядзеньня масавай культурна-асьветнай працы моладзь, забясьпечваючы комсамольскі ўплыў і кіраўніцтва, шляхам удзелу комсамольцаў ва ўсіх выглядах культурнай працы.

М. Р.

Прапановы

аб становішчы ўдзелу комсамольцаў у вытворчых камісіях і нарадах і аб далейшых задачах у гэтай галін

Усім вытворчым ячэйкам ЛКСМБ.

Пасьля абгаварваньня на нарадзе прадстаўнікоў КСМ ў вытворчыя камісіі з 25 прадпрыемстваў з удзелам старшынь вытворчых камісій выяўлена наступнае:

1) Што колькасны і якасны ўдзел моладзі ў вытворчых камісіях і нарадах слабы, асабліва вучняў падлеткаў. Гэты слабы ўдзел тлумачыцца:

а) Слабым нажымам з боку ячэек КСМ на гэтую галіну працы. Адсутнасьцю кіраўніцтва і кантролю над прадстаўнікамі ў вытворчыя камісіі, у выніку чаго ў прадстаўнікоў моладзі няма сваёй думкі па асобным пытаньням, разьбіраемым на вытворчых камісіях і на нарадах. Адсутнічае праца па ўцягненьню комсамольцаў у працу вытворчых нарад.

б) Адсутнасьць працы профорганізацый, у прыватнасьці фабзавкомаў і вытворчых камісій па прыцягненьню рабочай моладзі да ўдзелу у гэтай працы.

в) Вытворчыя нарады склікаюцца тады, калі моладзь займаецца ў школах, ці выконвае комсамольскія абавязкі.

г) Вельмі рэдка ставяцца на вытворчых камісіях і нарадах пытаньні працы і адукацыі моладзі, якія зацікавілі-б моладзь вытворчымі нарадамі.

д) Назіраюцца моманты нядбайных адносін да прапаноў высоўваемых моладзьдзю.

е) Вельмі слаба наладжаны вучот гэтай працы і высьвятленьне гэтага пытаньня ў друку і на комсамольскіх сходах.

2. Ня гледзячы на палепшаньне вытворчай дысцыпліны і павышэньне зацікаўленасьці да кваліфікацыі назіраюцца яшчэ да гэтага часу:

а) Прагулы сярод моладзі і недастатковая барацьба ячэек да зьнішчэньня гэтага і таксама няшчыльнасьць рабочага дню сярод падлеткаў, што выклікаецца частым перакіданьнем вучняў з аднаго месца на другое, адсутнасьцю інструмантаў і дастатковага кантролю над іх працай.

б) У сувязі з правядзеньнем зьдзельшчыны і падзелу працы, назіраецца нездаровая цяга моладзі да пераходу на зьдзельшчыну, забываючы аб неабходнасьці павышэньня сваёй кваліфікацыі.

На прыцягненьне комсамольцаў і беспартыйнай моладзі да актыўнага ўдзелу ў вытворчых камісіях і нарадах павінна быць асяродкавана ўвага ўсяго комсамолу, профсаюзаў і гаспадарчых органаў Беларусі, увязаўшы пачатак гэтай працы з правядзеньнем конкурсу на лепшую вытворчую ячэйку.

Усім ячэйкам неабходна правесьці наступныя практычныя мерапрыемствы:

1) Разгарнуць працу па растлумачэньню ў комсамольскіх ячэйках навокал конкрэтнага удзелу комсамольцаў ў вытворчых камісіях і нарадах. Пэрыодычна ставіць справаздачы сваіх прадстаўнікоў і асобных комсамольцаў, актыўна працуючых ў вытворчых нарадах, на бюро і на сходах ячэйкі. Б... адкладна вылучыць прадстаўнікоў туды, ... іх няма дамагаючыся такога становішча ... большасьць комсамольцаў добраахвотна ... ведвала вытворчыя нарады і рыхтавала прапановы па тых ці іншых пытаньнях вытворчасьці.

2. Уключыць у круг пытаньняў разьбіраемых вытворчымі камісіямі і нарадамі пытаньні працы і адукацыі моладзі, раней ... весьціўшы і падрыхтаваўшы да г тага моладзь. Асабліва належыць сачыць за правядзеньнем пастаноў вытворчых камісій ... пытаньням моладзі ў жыцьцё.

3. Вытворчыя нарады павінны склікацца ў дні, калі моладзь не занята ў школах, р... грузіўшы ў гэты дзень комсамольцаў ... комсамольскай працы.

Нарада просіць ЦК ЛКСМБ даць дырэктыву сумесна з ЦСПСБ сваім нізавым організацыям аб прыцягненьні рабочай моладзі да ўдзелу ў вытворчых камісіях і нарадах ... уключэньня пытаньняў аб моладзі ў п... працы вытворчых камісій і нарад.

5. Неаслабна павінна весьціся барацьба з прагуламі і за ўшчыльненьне працоўнага дню.

Неабходна высунуць лёзунг „Ні воднага спазьненьня на працу, ні воднай хвіліны прастою машыны ў часе працы моладзі".

Неабходна кожны такі выпадак асьвятляць у насьценгазэтах, утвараць політсу... прыняўшы захады каб вучні не перакідаліся з аднаго месца ў другое.

6. Галоўная ўвага павінна быць удзелена на вытворчаму выхаваньню моладзі і па... шэньню кваліфікацыі.

Рабіць гэта трэба лепшай падрыхтоўкай вытворчых вечароў, утвареньнем вытворчых куткоў пры клюбах моладзі і юнсэкцый, спэцыяльных насьценных і сьветавых газэт, організацыяй тэхнічных гурткоў па вывучэньню вытворчасьці.

Неабходна максімальна павышаць кваліфікацыю моладзі і падлеткаў, змагаючыся з несваечасовым пераходам на зьдзельшчыну, прыстасоўваючы навучэньне да рацыяналізацыі вытворчасьці (падзел працы і інш).

Юнацкаму друку трэба зьвярнуць больш увагі на высьвятленьне шляхам штомесячных аглядаў па прадпрыемствам, дысцыпліны моладзі, працы вытворчых камісій і нарад, працы брыгад і ФЗВ, адзначаючы дасягненьні, недахопы і накіроўваючы іх працу. Для гэтага юнкорам павінны быць дадзены належныя паказаньні.

Жыцьцё братоў за межамі.

За тое, што комсамолец—у турму

За апошні год у капіталістычных краінах Эўропы мы мелі ўзмацненьне белага тэрору і гвалтаў, якім, галоўным чынам, падлягае моладзь.

У Італіі, штодзённа арыштоўваюцца комсамольцы. За апошні час некалькі сот комсамольцаў было забіта.

У сучасны момант у італьянскіх турмах сядзіць 300—400 комсамольцаў, 80 комсамольцаў саслана на далёкія высьпы Усьцік, Пантылярыя і г. д.

Зараз высланы 2 члены ЦК італьянскага комсамолу на пустынную высьпу, акрамя таго, 3 члены ЦК прыгавораны да ссылкі, але яшчэ ня злоўлены.

У Францыі, на дэмократычнай шыльдзе якой стаяць пекныя словы: «Свабода, равенства і брацтва», з комсамольцамі распраўляюцца таксама жорстка, як і ў Італіі.

Зараз у францускіх турмах сядзіць 40 комсамольцаў, з іх 3 члены ЦК. Калі вялася вайна ў Мароко і комсамольцы выступілі за братаньне, іх лавілі і штрафавалі за малейшы ўчынак.

Нядаўна закончыўся процэс генэральнага сакратара францускага комсамолу тав. Барбэ. Тав. Барбэ прыгавораны да ... гадоў турэмнага заняволеньня за тое, што ён выставіў лёзунг братаньня з рыфамі.

Тав. Гайяр, член ЦК КСМ і тав. Курцюа — рэдактар комсамольскай газэты «Авангард» – кожны прыгаворан да 6 месяцаў турмы.

За апошні год ураганам пранесься белы тэрор па Балканскіх краінах. ... МЮДаўскія дні у Баўгарыі быў разагнаны комсамол і злоўленыя у Сафіі комсамольцы былі пераданы ваенна-палявому суду, які прыгаварыў іх да расстрэлу.

За апошні час узмацніўся тэрор ... Польшчы. Зараз у Польшчы сядзяць больш 1000 комсамольцаў. Нядаўна адбыўся суд над 5 комсамольцамі, якія абвінавачваліся ў організацыі піонэрскіх атрадаў.

Нядаўна быў суд над комсамольцамі ў Румыніі, якія выдавалі сваю падпольную газэту «МАЛАДЫ ЛЕНІНЕЦ». Была выкрыта друкарня, і некалькі злоўленых комсамольцаў адпраўлены на прымусовыя працы.

С. Ч.

Комсамольцы Ханькоў.

Па ўсёй провінцыі Хубэй, галоўным горадам якой зьяўляецца Ханькоў, раскіданы нашы організацыі. Да прыходу Кантонскіх войск у Хубэі комсамольская організацыя складалася амаль толькі з адных студэнтаў. Але цяпер тры чвэрткі уханскай організацыі—маладыя рабочыя.

Становішча рабочай моладзі значна палепшылася. Пры ўладарстве У-Пэй-Фу рабочыя ў Хубэі мелі толькі адзін дзень адпачынку ў гаду. Цяпер-жа профсаюзы дабіліся таго, што кожны тыдзень, па нядзелях, прадпрыемствы не працуюць.

Нашы ячэйкі ў большасьці організоўваюцца студэнтамі. Калі ствараецца група моладзі, жадаючай пастуніць у комсамол, на прадпрыемстве організоўваецца гурток, які кіруецца студэнтам. У далейшым, калі вырастае рабочы актыў, студэнтаў зьмяняюць маладыя рабочыя.

Цяпер у Ханькоў большасьць сакратароў ячэек—рабочыя ад варштату.

Асабліва многа ўступіла новых сябраў у комсамол пасьля шанхайскіх падзей, ў 1925 годзе, (расстрэл рабочых). Раней, калі ў Ханькоў быў У-Пэй-Фу, мы працавалі нелегальна, часта рыскуючы жыцьцём, цяпер-жа амаль на кожным прадпрыемстве ёсьць ячэйкі. Прадпрыемца ня можа выгнаць комсамольца, затым што ён павінен адказваць за гэта перад профсаюзам.

Лі.

Мы яшчэ слаба удзельнічаем у вытворчым жыцьці прадпрыемства.

Неабходна больш організаванае кіраўніцтва збоку ячэек партыі і комсамолу працай комсамольцаў—маладых рабочых, прымаючых удзел у вытворчых камісіях і нарадах; неабходна згрупаваньне вакол ячэек КСМ вытворчага актыву з моладзі шляхам шырокага азнаямленьня мас моладзі з іх працай у адзначаных камісіях і нарадах, устанавіць больш уважлівыя адносіны да іх прапаноў і аказаньню дапамогі ў іх ажыцьцяўленьні.

(З рэзолюцыі апошняга пленуму ЦК КП(б)Б аб працы ЦК ЛКСМБ і становішчы комсамолу Беларусі)

Што сказала нарада

Рэдакцыяй газэты «Чырвоная Зьмена» умесна з Менскім Акругкомам ЛКСМБ была праведзена нарада комсамольцаў-сяброў вытворчых камісіі па пытаньню аб удзеле моладзі ў вытворчым жыцьці нашых прадпрыемстваў.

З дакладам аб удзеле моладзі у вытворчым жыцьці Менскай Электрычна-Водаправоднай станцыі выступіў сакратар ячэйкі Эльводу **тав. Грынберг**.

арада тады, калі і школа...

Наша вытворчая камісія працуе ня усім нормальна, напрыклад, ня часта збіраецца. Што датычыцца вытворчых нарад, дык тут трэба адзначыць, што моладзь прымае больш-менш здавальняючы удзел. Кепска тое, што нашы комсамольцы не атрымлівалі асобнай—вызначанай лініі ад ячэйкі, ня было над імі ніякага кіраўніцтва.

На нарадзе выказалася з васьмі прысутвых комсамольцаў—толькі трое. Гаварылі яны даволі спраўна. Адзначалі, што ў канторы Эльводу яшчэ вялікая папяровая валакіта, ня добра скарыстоўваецца рабочая сіла, праца даецца часта не па кваліфікацыі. Адзін выступаў супроць дырэктора і даводзіў яму, што вытворчасьць працы пакуль-што яшчэ не паднялася.

Зарплата у нас на Эльводзе для вучняў павысілася на $8^1/_2$ проц. Есьць у нас толькі адна вучнёуская брыгада. Бываюць навет у нас думкі, што гэтая брыгада перашкаджае вытворчасьці хаця наколькі вядома яна за два тыдні дала 80 рублёў прыбытку.

Адносіны да вучняў не заўсёды добрыя. Есьць вучні, якія прапрацавалі у адным цэху год, а потым яго пераводзяць у другі цэх.

Брыгадзір вадаправоднага цэху да вучняў адносіцца кепска.

У нас былі спробы да стварэньня тэхнічнага гуртка, але нічога з гэтага пакуль-што ня вышла. Існаваў гурток па рысаваньню, але ён таксама распаўся.

Дысцыпліна у нас ня зусім добрая. Хлопцы любяць пабалавацца ў часе працы (Напрыкл., пачынаюць шапкі кідаць і бак).

На апошнім тыдні ў нас на сходзе ячэйкі стаяла пытаньне аб удзеле ў працы вытворчай камісіі. На гэтым сходзе адзначылі, што неабходна наш удзел у вытворчай камісіі зрабіць больш плянавым.

Немагчымасьць сумяшчаць вячэрнюю школу з вытворчымі нарадамі перашкаджае нашаму ўдзелу ў выт. нарадаю. **Нарада амаль, што заўсёды склікаецца тады, калі нам трэба йсьці ў школу.** Заўком зусім не рэагіраваў на слабую актыўнасьць з боку моладзі.

Гэтымі днямі будзе пастаўлена...

Клімовіч: (Старшыня вытворчай камісіі Эльводу).

З прычыны рознастайнасьці, вучням цяжка азнаёміцца з усёй нашай вытворчасьцю. Працуюць яны толькі у сьлясарным і машынных цэхах.

Дзўно вядомы тып.

У выніку гэтага мы маем і ня зусім актыўны удзел моладзі ў вытворчых нарадах.

Мы увялі мэтад прэміраваньня майстроў, каб яны лепш абучалі вучняў. У нас гэтымі днямі пытаньне аб прыцягненьні моладзі для больш актыўнага удзелу у вытворчых нарадах будзе пастаўлена ў заўкоме рубам.

Адзін—і той не зьяўляецца

Тав. Сьцяпанаў (Старшыня выт. камісіі пры мясцкоме пуці Зап. чыгункі). Вытворчыя нарады моладзь наведвае слаба. У вытворчую камісію вылучан адзін комсамолец, але і ён часта не зьяўляецца. Я аб гэтым паведамляў сакратара ячэйкі, але нічога з гэтага не вышла. Наша моладзь наогул мала цікавіцца жыцьцём вытворчасьці. Ячэйкам не перашкодзіла-б зьвярнуць на гэта увагу.

Таксама і з вылучаным прадстаўніком. Каб яму ячэйка давала дырэктывы, ён бы ведаў, што робіць і больш цікавіўся-б працай ў вытворчай камісіі.

Хацелі пайсьці, а сакратар ня пусьціў.

Райцэс (сельска-гаспадарчыя майстэрні). Наша вытворчая камісія зьяўляецца ў ляхаўскім раёне паказальнай. Комсамольцы маглі б прыняць актыўны удзел ў працы вытворчых нарад, але часта сама ячэйка перашкаджае гэтаму. Быў у нас факт, калі сакратар комсамольскай ячэйкі затрымаў 5 комсамольцаў на піонэрскай нарадзе і адняў у іх магчымасьць пайсьці на вытворчую нараду, якая ў гэты-ж час працавала.

Нашы вучні маюць значныя посьпехі. Некаторыя ўжо самастойна выконваюць асобныя заказы. Мы думаем узнагародзіць цяпер некаторых майстроў.

На папярэднім сходзе комсамольскай ячэйкі быў пастаўлен даклад Цэнтраземскладу. Выказваліся амаль што ўсе комсамольцы, гаварылі аб далейшай працы, ўнасілі конкрэтныя прапановы.

Была вылучана камісія для выпрацоўкі рэзолюцыі. А потым мы гэтую рэзолюцыю ўнясём на абгаварэньне вытворчай нарады.

У адносінах дысцыпліны у нас справа абстаіць таксама кепска. Хлопцы ганяюцца за зьдзельшчынай. Стараюцца ісьці ў той цэх, дзе можна больш зарабляць.

А мы і ня ведалі...

Табула (Старш. выт. каміс. сельгасп. майст.)

Я, праўду кажучы, да сёньнешняга дню ня ведаў, што ў вытворчай камісіі ёсьць прымацаваны ад моладзі.

Аб тым-жа кажа прадстаўнік вытворчай камісіі заводу «Энэргія» тав. **Лайкенгауз**.

Больш пытаньняў моладзі

Тав. Мірынгоф (ЦК ЛКСМБ).

Факт Эльводу, калі, замест вылучанага ў вытворчую камісію таварыша, справаздачу аб яго працы у вытворчай камісіі робіць сакратар ячэйкі, ясна кажа аб тым, што мы на гэтую працу вылучаем ня лепшых таварышоў.

Мы павінны на вытворчых нарадах і камісіях больш часта ставіць пытаньні кваліфікацыі моладзі, прыстасаваньня нашых програм для вучняў, да мясцовых умоў. Мы можам шмат чаго зрабіць у галіне ўдзешаўленьня навучаньня.

Многае залежыць і ад самых вытворчых камісій. Яны павінны больш падбіраць і ставіць часта пытаньні цікавячыя моладзь.

Бывае майстар любіць падарункі...

Пытаньне аб урэгуляваньні гэтага «паралелізму» паміж школай і вытворчай нарадай неабходна вырашыць як найхутчэй.

Добра толькі ў адным мясцкоме

Тав. Комар (Заходн. чыгункі). У нас на станцыі Зах. чыгункі існуюць тры мясцкомы. У кожным ёсьць прадстаўнік ад моладзі.

Вытворчыя нарады наведваюцца добра толькі у адным мясцкоме.

На нарадах моладзь ўносіла прапановы і наогул прымала актыўны ўдзел. Напр., у школе ФЗВ ставілася пытаньне аб удзешаўленьні навучаньня.

Кепска тое, што ня ўсе нашы ячэйкі займаюцца пытаньнем жыцьця прадпрыемства. Ні ў воднай ячэйцы такіх дакладаў ня было.

Мы наш удзел у гаспадарчым жыцьці прадпрыемстваў ажыцьцяўляем яшчэ і праз нашы насьценныя газэты, дзе моладзь часта піша аб тых ці іншых недахопах.

Я, „бацькі“, так і „дзеці“

Тав. Ліўшыц (I-друкарня). Нельга вініць толькі моладзь, за слабы ўдзел у вытворчых нарадах. Гэтаму прычынай зьяўляюцца папершае вучоба і падругое моладзь заўсёды глядзіць на дарослых рабочых. Бывае, што старыя рабочыя ня ідуць на нараду, тады і моладзь ніяк не зацягнеш туды. Шмат конкрэтных прапаноў моладзь наша высоўвае праз насьценную газэту. На сходзе ячэйкі даклад адміністрацыі ні разу ня ставіўся.

Сьпярша забарабанілі, а цяпер заціхлі.

Тов. Шнэйдэр (АК ЛКСМБ). У нас да гэтага часу ня было плянавасьці ў гэтай працы. Прадстаўнікам ў вытворчыя камісіі збоку комсамольскіх ячэек не даваліся ніякія паказаньні. Мы ў ячэйках паднялі кампанію па актыўнаму ўдзелу моладзі ў вытворчым жыцьці забарабанілі, а потым заціхлі. Мы на ячэйках амаль што ніколі не абгаварваем пытаньняў прапаноў, якія трэба высунуць перад вытворчай камісіяй. Мы часам выносім вялікія рэзолюцыі аб социялістычным будаўніцтве, але мала праводзім конкрэтных мерапрыемстваў. Ці бывае, што бярэмся за што небудзь конкрэтнае, але не праведаем, як выконваюцца нашы прапановы.

Аб дысцыпліне колькі мы ня размаўляем, але яна яшчэ не такая, якая патрэбна быць на вытворчасьці.

Мы можам аказацца ў такім становішчы, калі моладзь у пагоне за зьдзельшчынай, зусім ня будзе атрымоўваць кваліфікацыі.

Праўда, мы ведаем многія ячэйкі, якія ўзяліся за конкрэтную справу, маюць шэраг посьпехаў, але і гэтыя ячэйкі ніколі сваім вопытам ня дзеляцца на старонках «Чырвонай Зьмены» і наогул ў нашым друку, ячэйкі мала высьвятляюць тое, што яны зрабілі, што ім перашкаджае.

У хуткім часе распачнецца конкурс на лепшую ячэйку па ўдзельнічаньню ў гаспадарчым жыцьці і вытворчых нарадах свайго прадпрыемства.

Ячэйкам толькі неабходна падцягнуцца

У канцы працы нарада прыняла шэраг практычных прапаноў усім вытворчым ячэйкам, зьмяшчаныя на 2 стр.

За аднаўлёную зямлю

— Народны Камісар Земляробства БССР т. Прышчэпаў конкрэтна і выразна ставіць перад комсамолам задачы па сельскай гаспадарцы.—Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ раіць усім вясковым ячэйкам прапрацаваць артыкул на адчыненых сходах.

Прызнаючы за комсамолам яго вялікую ролю ў сучасным нашым будаўніцтве, я хацеў-бы конкрэтна і выразна паставіць тыя некаторыя задачы па сельскай гаспадарцы, за вырашэньне якіх зараз павінен узяцца комсамол і ў гэтай справе павесьці за сабою ўсю вясковую моладзь.

Чаго-ж комсамол павінен пачаць працу

К тым практычным навыкам і ведам, якія ў кожнага працаваўшага на гаспадарцы комсамольца маюцца, трэба дадаць элементарныя веды па агрономіі, коопэрацыі, рахункаводзтву, якія папробваць практычна ў гаспадарцы ажыцьцявіць.

Таму неабходна больш прадстаўнікоў комсамолу пасылаць на агрономічныя курсы, па жывёла-гадоўлі, коопэрацыі, па ільну, торфу, агнятрываламу будаўніцтву, садоўніцтву і г. д.

Сярод комсамолу ёсьць шмат добра падрыхтаваных хлапцоў, якім і каротка-тэрміновыя спэцыяльныя курсы дапамогуць зрабіцца добрымі організатарамі сельскай гаспадаркі, асабліва тым, якія зараз працуюць на гаспадарцы.

Многія веды па сельскай гаспадарцы можна атрымаць праз популярную літаратуру, якой можа і павінна запасьціся кожная ячэйка. Добра падрыхтаваныя па сельскай гаспадарцы комсамольцы будуць добрымі організатарамі беспартыйнай моладзі ў гаспадарчым будаўніцтве.

Працу сярод беспартыйнай моладзі за лепшую сельскую гаспадарку трэба праводзіць у організаваным парадку. Трэба ажывіць працу і значна пашырыць лік сельска-гаспадарчых гурткоў.

У агропропагандзе трэба браць жывыя прыклады з сваіх вёсак і гаспадарак. Калі будзе праводзіцца суд над трохпалёўкай, дык яе ня трэба выдумляць, а ўзяць сваю трохпалёўку і з алоўкам у руках падлічыць колькі зямлі пустуе кожны год у папары, чаму ўраджаі не растуць пры няўмелым чарадаваньні культур і параўняць з прыбыткам тых гаспадарак, якія перайшлі на шматпольле. І тут малюнак будзе выразны, ён сам скажа сялянам, які ім трэба рабіць вынік—марнець пастарому ці пачаць барацьбу за новую і лепшую гаспадарку.

Аб'явіць вайну межам.

Разам з гэтым моладзі трэба звярачваць увагу і на межы, парослыя рознымі сарнякамі.

Пара аб'явіць вайну межам, трэба іх зьнішчыць. Яны зьяўляюцца выхавальнікам рознай заразы для нашай сельскай гаспадаркі. Над імі трэба правясьці агросуды і на сялянскіх сходках дабіцца таго, каб іх зьнішчылі. **Нашы палі павінны ачысьціцца ад сарнякоў, тады і ураджаі палепшацца і павялічацца.**

Галодныя каровы кожную весну просяць палепшыць гаспадарку.

Агросуды трэба праводзіць над каровай, прыцягваючы да суда і самых сялян, якія ня ўмеюць даглядзець сваю жывёлу. Каб дабіцца пры гэтым належнага эфэкту, трэба праводзіць паказальнае карменьне па нормах і пасьля параўнаць, які прыбытак карова давала пры звычайным доглядзе, і што дала пры норміраваным кармленьні. Адразу высьвятліцца для сялян неабходнасьць сеяць канюшыну, кармавыя караньплоды, віку, сэрадэлю. Без такога корму малочнай гаспадаркі не з'організуеш. А пасьля гэтага само сабой паўстане пытаньне і аб зьнішчэньні трохпалёўкі і патрабуецца пераход на шматпольле.

Пад суд дрэннае насеньне

Суды трэба праводзіць пад дрэнным насеньнем, разам з гэтым даказваючы неабходнасьць уводзіць сартавое насеньне і новыя культуры. У тых мясцох, дзе сяляне асабліва ня будуць верыць агропропагандзе, трэба практыкаваць закладку паказальных вучасткаў на гаспадарках комсамольцаў з угнаеньнем, канюшынай, лепшымі гатункамі культур з тэй мэтай каб на прыкладах яскрава даказаць пераважнае значэньне новых мерапрыемств і культур.

А разам з гэтым

комсамол павінен распачаць шырокую кампанію па зернаачыстцы. Без ачысткі насеньня нам не магчыма пашырыць ураджайнасьць. Ачыстка зьяўляецца самым простым і цяпер ужо папулярным мерапрыемствам і комсамолу трэба паставіць так сваю працу, каб кожная вёска, ці пасёлак мелі машыны і прылады па зернаачышчэньню. Праводзячы кампанію па зернаачыстцы, само-сабою паўстане пытаньне і

аб організацыі насеньняводных таварыстваў

Патрэбна на канюшыну, віку, сэрадэлю, лубін, кармавыя караньплоды, сартавыя аўсы, ячмяні, бульбу, агароднае насеньне з кожным годам пашыраецца. Дзяржаве і сялянству прыходзіцца губіць шмат грошай й накладных выдаткаў, каб забясьпечыць насеньнем нашых сялян, прывозячы яго з другіх краін, тым часам, як організаваўшы таварыства насеньняводаў магчыма ўсе гэта насеньне здабыць на месцы ў кожным раёне і сельсавеце і загатоўка яго, такім чынам, абойдзецца дзешавей і насеньне будзе акліматызыраваным.

Трэба закладаць выхавальнікі.

Мы маем вельмі спрыяючыя ўмовы для разьвіцьця ў нас таварнага садоўніцтва. Але-ж ня гледзячы на гэта, нашы сяляне перайшоўшы на пасёлкі, садзяць толькі два-тры дрэвы, якія ніякай карысьці ім не даюць. Тлумачыцца гэта тым, што у нас пакуль што няма пасадачнага матар'ялу і тым, што сяляне не чакаюць прыбытку ад сада. З такім рэакцыйным і неправільным поглядам трэба рашуча змагацца організацыяй грамадзкіх таварных садоў. Для гэтага ў тых мясцох, дзе мала заложана дзяржаўных выхавальнікаў, трэба закладаць грамадзкія выхавальнікі, каб хутчэй забясьпечыць сялянства пладовымі матар'яламі.

Падрыхтоўваць коопэратараў.

Разьвіцьцё нашай сельскай гаспадаркі ставіць пытаньне аб організацыі розных відаў сельска-гаспадарчай коопэрацыі. Коопэрацыя ў нас справа новая і маладая і комсамол павінен навучыцца тэорыі і практыцы коопэрацыйнага будаўніцтва бо галоўным чынам праз гэту форму будзе праходзіць організацыя социялістычнага земляробства.

Ужо зараз адчуваецца патрэба ў організацыі машынных, масладзельна-сыраварных, насеньняводных і іншых таварыстваў. Уся трагэдыя у тым, што у нас няма добрых організатараў.

Комсамол павінен пільна ўзяцца за падрыхтоўку коопэрацыйных працаўнікоў для вёскі. Праз спэцыяльныя курсы і нашы тэхнікумы.

Гурткі дасьледчыкаў, земляўпарадкаваньне і мэліорацыя.

Пажаданай зьяўляецца організацыя гурткоў маладых дасьледчыкаў, бо толькі праз досьледы нам удасца дабіцца магутнага росквіту сельскай гаспадаркі.

Пры земляўпарадкаваньні вялікую значнасьць мае абраньне тэй ці іншай формы землякарыстаньня. Ад яе ў будучыне будзе залежыць правядзеньне коопэрыраваньня і пабудова социялістычнай гаспадаркі. Комсамолу трэба прымаць актыўны ўдзел у земляўпарадкаваньні і даваць яму пажаданы для нас напрамак.

Вялізарная задача стаіць перад сялянствам па мэліорацыі, культуры балот і торпараспрацоўкам. Комсамол павінен мобілізаваць усю вясковую моладзь, і організаваць справу так, каб мэліорацыйныя таварыствы перашлі да колектыўнага земляробства.

Такім чынам у сельскай гаспадарцы толькі працы, што канца краю ня відаць, і комсамол павінен аб'яднаць усю вясковую моладзь на рашучую барацьбу за лепшую сельскую гаспадарку, **за аднаўлёную зямлю.**

Народны Камісар Земляробства БССР З. ПРЫШЧЭПАЎ.

Ужо вясна, а восеньню-экзаміны...

Будзем падрыхтованы да прыему ў ВНУ.

Школьная колегія ЦК ЛКСМБ праводзіць дзейную падрыхтоўку да прыему ў ВНУ і тэхнікумы у 1927-28 годзе. Ужо праведзены наступныя мерапрыемствы:

Прапанавана ўсім комсамольскім камітэтам арганізаваць каротка-тэрміновыя курсы для рабоча-сялянскай моладзі дзеля падрыхтоўкі апошняй у ВНУ.

Комсамольскія організацыі павінны ўзяць на вучот усіх комсамольцаў і беспартыйную рабочую моладзь, жадаючую паступіць у ВНУ, дзеля абхопу яе курсамі. Апошнія будуць існаваць на самааплаце, а таксама на субсыдыі грамадзкіх організацый.

Таксама школьная колегія **прапануе аслабаніць ад комсамольскай нагрузкі комсамольцаў, жадаючых паступіць у ВНУ, каб яны мелі магчымасьць заняцца падрыхтоўкай.**

Згодна цыркуляру школьнай колегіі ЦК, комсамольскія організацыі павінны паклапаціцца **аб павялічэньні рабочага асяродку ў ВНУ пры прыеме ў гэтым годзе.**

Профтэхшколы Гомельшчыны.

Нядаўна прадстаўніком ЦК ЛКСМБ і Галоўпрофасьветы праведзена абсьледваньне Гомельскіх профтэхшкол і фабзавучаў.

Абсьледваньне выявіла здавальняючую ўвагу з боку комсамольскіх органаў і органаў Нарасьветы да пытаньняў профтэхадукацыі.

Некаторыя профтэхшколы знаходзяцца ў цяжкім матар'яльным становішчы.

Вясеньнія вакацыі.

Згодна пастановы Акрапа, вясеньнія вакацыі ў Менскіх школах—сямігодках адбудуцца паміж 1-м і 10-м красавіка.

У профтэхшколах вясеньніх вакацый сёлета ня будзе.

Ведаць свой край!

○ Наркамасьветы зацьвердзіў статуты краязнаўчых гурткоў пры школах, тэхнікумах, курсах і таварыствах краязнаўства пры вышэйшых навуковых установах. Статуты надрукаваны ў другім нумары часопісі «Наш край».

○ У хуткім часе выходзяць з друку працы 2-га ўсебеларускага краязнаўчага зьезду.

○ Пры ЦБК організаваны школьна-краязнаўчая і студэнцкая камісіі, якія будуць кіраваць працай гурткоў краязнаўства пры школах і навучальных установах.

○ Другі ўсебеларускі краязнаўчы зьезд прызнаў неабходным: павялічыць шэрагі краязнаўчых організацый за лік комсамольцаў, піонэраў і рабоча-сялянскага актыву.

Што сказаў 10 зьезд КПБ

У першых лічбах красавіка выходзіць з друку Стэнографічная справаздача 10-га зьезду КПБ, дзе зьмешчаны даклады, заслуханыя на зьезьдзе, спрэчкі па ім, рэзолюцыі і г. д.

Кніга выходзіць на расійскай мове, разьмерам у 500-600 старонак. Яна будзе каштаваць 1 р. 80 к.

Барацьба за зьніжаную цану

○ Гэтымі днямі выяжджае з Менску камісія ў складзе прадстаўнікоў акруговай кантрольнай камісіі і Наркамгандлю. Камісія абсьледуе вясковыя коопэратывы Менскай акругі і праверыць як там ідзе зьніжэньне цэн.

○ Барысаўскі цэрабкоп зьнізіў розьнічныя цэны на наступныя тавары: паркаль (7 проц.), боты (8 проц.,) шкло ваконае (5 проц.) і г. д. Але зднячасова павышаны цэны на масла і соль.

○ Наркамгандлем устаноўлены новыя цэны на сахар.

Кілё сахарнага пяску ў Слуцку, Барысаве, Віцебску, Полацку і Воршы павінна каштаваць 61 кап., у Бабруйску, Менску, Магілеве, Клімавічах—60 кап., у Гомлі, Рэчыцы, Мазыры—59 кап.

Сярод маладнякоўцаў.

Новыя кнігі.

Падрыхтаваны да друку: зборнік апавяданьняў Ал. Дудара пад назвай „Марсэльеза" і дзьве п'есы для вясковага тэатру В. Сташэўскага.

Здадзены ў друк кніжкі: В. Каваля—„Як вясну гукалі" (зборнік апавяданьняў), А. Звонака—„Веянь" (зборнік вершаў) і П. Галавача — „Дробязі жыцьця" (апавяданьні).

Вышлі з друку:—3-ці нумар часопісі „Маладняк" (за сакавік месяц) і літаратурны зборнік Магілеўскай філіі „Дняпроўскія ўсплёскі".

У дапамогу літгурткам.

ЦБ „Маладняка" распрацавала статут і праграмы для літаратурных гурткоў. Гэтыя матар'ялы надрукованы і разасланы па ўсіх філіях. Хутка яны будуць выданы асобнай брошурай.

НА БАРТУ ПАДШЭФНАГА

Дэлегацыя менскай комсамоліі на лінкоры „Парыская Комуна"

15-га сакавіка.

На ст. Менск МББ чыгункі наша дэлегацыя на лінкор «Парыская Комуна» чакае цягніка.

У склад дэлегацыі ўваходзіць 6 чалавек. Яны вязуць падшэфным маракам прывітаньне і падарункі Менскай комсамоліі...

У вагоне разьвясяліліся. Засьпявалі, загутарылі...... Пецька Ільлін, які разьлёгся на лаўцы, ціхутка расьпяваў нейкую прыгожую мэлёдыю...

Уся дарога прашла весела.

17-га.

Толькі пачынае сьвятаць. Перад намі замялькалі пабудовы, раскіданыя вакол Ленінграду... Удалі яскравыя электрычныя аганькі...

— Ленінград!

Спрыгваем з вагону і накіроўваемся ў горад.

Да 6-ці гадзін вечара бегалі за прапускамі. Былі ў адміралтыйстве, у ДПУ.

Увечары, калі запасьліся прапускамі, цягніком прыбылі ў Арыенбаўм (гарадок каля Кранштату).

Адтуль мы рушыліся падводай па мёрзламу заліву да Кранштату.

Насустрэч нам нёсся моцны, халодны марскі вецер.

Ад холаду крыху знабіла... Але нічога!

У дарозе спыняліся ў 2-х «рагатках» («рагатка»—гэта праверачны пункт), скуль па тэлефону гаварылі з судном... Папярэдзілі...

Хутка нас сустрэлі 2 камандзіры з лінкору, з якімі мы накіраваліся да судна.

Удалі, скрозь шэры паўзмрок, мы заўважылі яскрава-чырвоны сьцяг, які вецер трапаў над лінкорам.

На судно прыехалі ў час ночы. Маракі ўжо крэпка спалі.

Рэчы, падарункі—усё было зьнесена ў каюты. Нас папаілі чаем з пячэньнем, дзякуючы чаму мы добра атагрэліся і настрой наш некалькі падняўся...

Але пачынала хіліць да сну.

Першую ночку мы начавалі на судне. Да гучнай музыкі матроскага храпеньня далучаўся і наш «комсамольскі оркестр»...

На заўтра былі перададзены торбачкі з падарункамі. Пасьля гэтага мы разышліся па «кубрыкам» (кубрык—гэта пакойчык для матросаў) сваёй падшэфнай роты, дзе доўга гутарылі з маракамі аб іх жыцьці-быцьці...

У цікавых гутарках дзень так хутка прашоў, што мы і не агледзіліся.

Вечарам быў вялікі вечар у Кранштаце, у Доме Чырвонай Арміі і Флёту.

Вечар нас добра азнаёміў з жыцьцём маракоў.

Начавалі ў казармах.

А раніцаю зноў на судно.

Разьвіталіся, абяцалі пісаць, мацней трымаць сувязь.

— Да пабачэньня, таварышы! Яшчэ можа спаткаемся калі-небудзь!

Дэлегат.

У тры радкі

○ У сярэдзіне красавіка месяца склікаецца ўсебеларускі зьезд паляўнічых.

○ Управа дзяржаўнага страхаваньня БССР адпусьціла 132.000 рублёў на барацьбу з пажарамі.

○ 31-га красавіка ў Менску пачынае выходзіць новая газэта на літоўскай мове, якая будзе абслугоўваць літоўскае насельніцтва БССР.

○ 96 комсамольцаў абраны ў склад гарадзкіх саветаў неакруговых гарадоў Беларусі.

○ 2700 беспрацоўных падросткаў налічваецца на вучоце юнсэкцыі Біржпрацы БССР.

○ 212 яўрэйскіх сем'яў будуць сёлета перaселена з Беларусі ў Крым і надзелена зямлёй.

Малады турысты, рэгіструйся!

У рэдакцыі „Чырвонай Зьмены" пачалася рэгістрацыя маладых турыстых БССР

Кожны малады турыст павінен прысылаць аб сабе ў рэдакцыю наступныя весткі: 1) фамілія, імя і па бацьку; 2) колькі год; 3) соцыяльнае становішча; 4) партыйнасьць; 5) якія месцы добра ведаеш; 6) якія вандраваньні ўжо зрабіў; 7) што маеш на мэце прадпрыняць; 8) адрас.

Турысцкія гурткі дасылаюць у рэдакцыю сьпісы сваіх сяброў па паказанай вышэй форме.

Весткі дасылаць па адрасу: Менск, Комсамольская 25, „Чырвоная Зьмена" „Турызм".

Запіс маладых вынаходцаў

У рэдакцыі «Чырвонай Зьмены» адчынен запіс усіх **маладых вынахо**цаў.

Маладыя вынаходцы павінны прыслаць у рэдакцыю наступныя весткі [аб] сабе:

1) фамілія, імя і па бацьку; 2) колькі год; 3) соцыяльнае становіш[ча]; 4) партыйнасьць; 5) месца працы; 6) якія вынаходжаньні ты зрабіў; 7) ці за[рэ]гістраваны гэтыя вынаходжаньні у ВСНГ; 8) над чым зараз працуеш; 9) даска[на]лы хатні адрас.

Весткі дасылай па адрасу; **Менск, Комсамольская 25. «Чырвоная Зьм[е]на» у аддзел «Маладыя вынаходцы».**

У суботу 26 сакавіка

а 6-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу КІМ (Комсамольская, 25) адбудзецца

— НАРАДА АБ ФОРМАХ — АЗДАРАЎЛЕНЬНЯ —) РАБОЧАЙ МОЛАДЗІ. (—

Рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена», Народны Камісарыят Ахо[в]ы здароў'я і Менакругком ЛКСМБ запрашаюць на нараду прадстаўнікоў ячэек у камісіі па ахове здароўя прадстаўнікаў у ЦП Саюзаў, экономпрацоўнікі ячэек заводу «Энэргія», заводу «Беларусь», 1 і 2 скураных заводаў, 1 і 2 друкарні, Меншвэю, заводу «Пролетары» МШВ Заходняй і МББ чыгунк.

Урачэй: **Смулевіч, Дыкрэр, Эйнгорн, Шапіра, Левін, Гурэвіч, Душман.**

Удзельнікаў дыскусіі па артыкулу «Мае прапановы», і т.т. **Зэйфмана, Джэлюка, Карнеева, Левіна, Кагана, Шнэйдэра.**

Просьба да ўсіх т. т. **не пазьніцца.**

Пабудуем самалёт.

Першы аб'яднаны пленум цэнтральных саветаў таварыстваў ТСА і Авіяхіму зьвярнуўся з заклікам да працоўных БССР аб зборы сродкаў на пабудову самалёту імя „ТСА—Авіяхім".

Адказы чытачам

Усім прыслаўшым запытаньні аб паступленьні ў ВНУ (№ 856) у красавіку месяцы ў „Чырвонай Зьмене" будзе надрукован спэцыяльны аддзел аб умовах і правілах прыёму у ВНУ і тэхнікумы.

Мізурэнкаву (№ 856) Усе комсамольцы-вучні плоцяць па 5 кап. у месяц сяброўскіх узносаў.

Дапішчыку (№ 857) Бюро абіраецца на сходзе ячэйкі. Што датычыцца абавязкаў—дык яны разьмяркоўваюцца на першым пасяджэньні новага складу бюро.

Славіну (№ 858) Твой ліст рэдакцыя накіравала ў Наркамзем для расьледваньня.

Т. (№ 859) Комсамольскі стаж сябра КСМ лічыцца з часу яго зацьверджэньня агульным сходам ячэйкі.

140.000.

За апошні час наглядаецца значны рост беларускага ТСА—Авіяхім. Організацыя налічвае зараз каля 140.000 членаў.

Крывое люстра.

Тварам да... сьцяны.

Выдавецтва «Чырвоная Зьмена» над[ру]кавала плякаты, у якіх былі зьмешча[ны] сьпіс выдаваемых газэт («Чырвоная Зь[ме]на», «Юнгер Арбэтэр» і г. д.) і ум[овы] падпіскі на іх. Памянёныя плякаты б[ылі] разасланы па ўсіх установах, дзеля [вывешаньня] ў[...] вескі на відных мясцох.

Атрымаўшы гэтыя абвесткі, дзела[вод] Менскага Гарадзкога Райкому ЛКСМБ т. Тарасевіч задумаўся над тым, як іх [вы]карыстаць. Аб тым, што месца іх [на] сьцяне, яму і ў голаў ня прыходзіла.

— Куды іх дзеваць ня вядома—б[ур]чэў сабе пад нос Тарасевіч. Надышл[о] розных там папер, абвесткі ды інш[ае], хоць рабі ты з іх што хочаш! Пр[а]вуму не прылажу...

Разважаньні дзелавода перарваў [ч]кімі райкому, палажыўшы перад ім тэкст апавяшчэньняў, якія трэба было напі[саць] і павесіць...

У гэты час «удалая» думка пра[бе]ла мазгі нашага дзелавода. Ён ад[ным] ударам заб'е двох зайцаў—напіша [апа]вяшчэньні і адначасова здолее выка[рыс]таць зласчасныя плякаты.

Праз паўгадзіны плякаты вы[да]вецтва віселі тварам да сьцяны, на іх адваротным баку былі нап[іса]ны апавяшчэньні аб пасяджэнь[ні] у РК...

Ажыцьцявіўшы сваю «геніальн[ую]» думку, дзелавод з любоўю і ласкай глядзеў на стварэньне сваіх рук і [па]дзякаваў выдавецтва «Чырвоная «Зьме[на»] за дасылку плякатаў, які знашлі т[акое] карыснае прымяненьне. Пасьля гэтага [ён] сеў за стол і з спакойным сумлен[ьнем] прыняўся за свае справы.

Хмара

Апавяшчэньні.

Менакругкому ЛКСМБ.

Сёньня, 25 сакавіка, а 10-й га[дзіне] ўвечары ў памяшканьні клюбу «КІМ» [...]кой № 10) адбудуцца заняткі сэмін[ару] працаўнікоў юнсэкцый па пытаньню бібліотэчнай працы. Павінны прысьці старшыні бюро юнсэкцый, сябры мас[авых] камісій і вылучаныя па бібліот[эчнай] справы.

Рэдакцыі.

Рэдакцыя выклікае на суботу 2[...] сакавіка, а 10 гадзіне раніцы, наступны[х та]варышоў: **Адашчыка, Шура Я., К[...]віча, Анішчука і Зэльцара.**

ЗАЧАРАВАНЫ КРУГ

Дзе корні высокай цаны на абутак?

Мы ўжо некалькі разоў пісалі аб высокай цане на абутак у магазынах МЦРК. Праўленьне апошняга ўжо прымае меры да зьніжэньня цэн на мужчынскія хромавыя боцікі.

Аднак, цікава ведаць—дзе корні высокай цаны на гэтыя самыя боцікі?

Каб вырашыць гэта пытаньне, мы з магазыну МЦРК, які гандлюе дарагім абуткам, дашлі да месца вытворчасьці — да **шавецкай майстэрні „Торгстрою".**

Нам трэба дасканала ведаць — чаму немагчыма зьнізіць цэны на абутак, выпушчаемы гэтай майстэрняй, чаму тут высокі сабекошт?

Але па парадку.

Менцэрабкоп. Ён ня можа зьнізіць цэн таму, што і без таго прыкладвае да прадаваемага абутку.

„Торгстрой", столькі, бач, ведае пра сваю майстэрню, колькі ведае пра яе Манакскі прынц! Каля пяці месяцаў майстэрня знаходзіцца пад кіраўніцтвам „Торгстрою", а калі рэдакцыі трэба было высьніць **прыкладвае трэст да свайго прадпрыемства, ці зарабляе на ім** яна не давядалася. Трэст, бачыце, не зрабіў яшчэ балянсу і нічога на гэтае „нявязкнае" пытаньне адказаць ня можа. І толькі пасьля ўходу—рэдакцыйнага супрацоўніка пачалася суматоха і пашлі тэлефонныя званкі: трэст пачаў рабіць „папярэднюю калькуляцыю". **Заўважце, што штурхачом для гэтага зьявіліся не інтарэсы справы, а тое, што „быў карэспондэнт з газэты"...**

Шавецкая майстэрня. Тут мы атрымалі цікавыя весткі аб сабекошце мужчынскіх хромовых бацінак. Вось гэтыя даныя:

Матар'ял на пару абутку	6 р. 26 к.
Рабочая сіла	4 р. 44 к.
Накладныя выдаткі	17 проц.

Усяго сабекошт пары мужчынскага хромавага абутку раўняецца 12 р. 52 к.

Адпушчае-ж яе майстэрня за 12 р. 18 к.

Прыблізна таксама абстаіць справа з жаночым хромавым абуцьцем.

Што-ж атрымоўваецца?

Спажывец атрымоўвае абутак па дарагой цане.

Менцэрабкоп церпіць агульную, простую і яўную страту пры розьнічным продажы.

„ТОРГСТРОЙ" церпіць страту пры оптовым продажы

Майстэрня таксама, бязумоўна, прыкладае свае капіталы да вытворчасьці гэтага злабытнага абутку...

У агульным—гісторыя з гэтым абуткам якасьці **зачараваны круг:** кожны хто датычыцца да яго, атрымоўвае страту. А ўсё-ж гэты абутак, які нікому нічога акрамя страты ня прыносіць—выраблялецца ў вялікай колькасьці і складае адносна ўсёй вытворчасьці майстэрні 70 проц.

А астатнія 30 проц.?

А астатнія 30 проц.—гэта так званы „галантарэйны" (шаўровы жаночы) абутак. На ім майстэрня мае чыстага прыбытку звыш 15 проц. (!!) **І гэты „галантарэйны прыбытак" пакрывае сабой „хромавую страту".** Толькі **пакрывае,** бо калі-б майстэрня пажадала што небудзь зарабіць, ёй прышлося-б сваю 15-ці процантную «божаскую» накідку павысіць далей...

Чым-жа растлумачыць такі высокі сабекошт хромавага абутку?

Прычын аказваецца многа.

Папершае—на кожную пару абутку падае 17 проц. накладных выдаткаў.

Падругое—за кожную пару абутку прыходзіцца плаціць рабочаму 4 р. 44 к. (у працколектыве на пару абутку прыходзіцца зарплаты 2 р.)

Патрэцяе—продукцыйнасьць працы за апошні, даволі значны пэрыод, стаіць на адным узроўню—7 пар абутку на кожнага рабочага штотыднёва.

Пачацьвёртае—аказваецца, што **скуртрэст і скурсындыкат ня зьнізілі яшчэ цэн на адпушчаемы майстэрні тавар.**

Гэтак абстаіць справа ў майстэрні.

Падагулім матар'ял: маленькае прадпрыемства, бязумоўна, **не завадзкога тыпу.** Проста пад адну страху сабраны сотні саматужнікаў-шаўцоў, працуючых **самым прымітыўным чынам.** Прадпрыемства слабае, **натолькі слабае,** што апека «Торгстрою» для яго шкадліва (цікава ведаць чаму гэта майстэрня патрэбна „Торгстрою"?)

Бяздоньне выдаткаў і няўменьне прыстасавацца да рынку.

Яўна хворая гандлёвая атмосфэра: мы лічым недапусьцімым „бязбожнае" павялічэньне цэн на адзін від прадукцыі для таго, каб атрымаць магчымасьць задаволіць сваю патрэбу ў прасажваньні капіталаў на ўбытачным тавары...

Абгаварыць пытаньне аб мэтазгоднасьці вылучэньня майстэрні ў зусім самастойную гаспадарчую адзінку, якая павінна будзе існаваць на самаўтрыманьні.

Гр

Ад рэдакцыі: Чакаем адказу на гэты артыкул ад «Торгстрою», Менцэрабкопу і рабочых майстэрні.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІН.

Галоўлітбел № 24448 2 Дзярждрукарня БДВ.